Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

***255 гадоў з часу заснавання парку***
***75 гадоў у статусе парку культуры і адпачынку***
***60 гадоў з часу прысваення статуса помніка садова-паркавага мастацтва***

# ЗЯЛЁНАЯ ЖАМЧУЖЫНА ГОРАДА

## КОБРЫНСКІ ПАРК

***інфармацыйна-пазнавальны даведнік з серыі «Ведай і любі свой горад»***

*2-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае*

Кобрын
2023

УДК 016:908(476.7)+712
ББК 91.9:28.5(4Беи)л6+77(4 Беи)
З99

***Складальнік***
С. Д. Курачук – бібліёграф І катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

З99 **Зялёная жамчужына горада** : інфармацыйна-пазнавальны даведнік. – 2-е выд, дапрац. і дап. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. бібліёграф І катэгорыі С. Д. Курачук. – Кобрын, 2023. – 116 с. : фат. – (Серыя «Ведай і любі свой горад»).

Інфармацыйна-пазнавальны даведнік выдадзены напярэдадні трох знакавых дат парку: 255-годдзя з часу заснавання, 75-годдзя ў статусе парку культуры і адпачынку, 60-годдзя з часу прысваення статуса помніка садова-паркавага мастацтва.

УДК 016:908(476.7)+712
ББК 91.9:28.5(4Беи)л6+77(4 Беи)

© ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», 2023

# У 2023 годзе
# КОБРЫНСКІ ПАРК імя А. В. Суворава




адзначае *3* адметныя даты:

**255** **гадоў з часу заснавання парку**

*(1768)*

**75** **гадоў у статусе парку культуры і адпачынку**

*(1948)*

**60** **гадоў з часу прысваення статуса помніка садова-паркавага мастацтва**

*(1963)*

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Кобрынскі парк імя А. В. Суворава адносіцца да ліку найстарэйшых у Беларусі. Невыпадкова гэты старажытны куток беларускай зямлі, дзе гісторыя і сучаснасць аб'ядналіся ў дзіўнае і непаўторнае цэлае, зацверджаны помнікам прыроды і садова-паркавага мастацтва рэспубліканскага значэння.

З невялікай сядзібы ён ператварыўся ў адзін з найбуйнейшых і прыгажэйшых садова-паркавых комплексаў сучаснай Беларусі, набыў непаўторны каларыт, стаў гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Названы ў гонар вялікага рускага палкаводца А. В. Суворава, якому належаў маёнтак «Кобрынскі ключ».

Кобрынскі парк - гэта не толькі прыгожы гістарычны куток прыроды ў гарадскім пейзажы, але і комплекс добрага настрою, цікавага і карыснага адпачынку. Штогод парк наведваюць дзясяткі тысяч турыстаў, гэта любімае месца адпачынку кабрынчан. Адных вабяць сюды багатыя на гістарычныя падзеі месцы, другіх – батанічныя асаблівасці парку, маляўнічыя куткі для рэлаксацыі з разнастайнай экасістэмай, трэціх – удзел у гарадскіх культурных мерапрыемствах, насычаныя гульнёвыя праграмы і атракцыёны. Парк - гэта месца, якім па праву ганарыцца горад, месца, дзе ніколі не заканчваецца свята.

Інфармацыйна-пазнавальны даведнік «Зялёная жамчужына Кобрына» выдадзены напярэдадні трох знакавых дат парку: 255-гoддзя з часу заснавання, 75-гoддзя ў статусе парку культуры і адпачынку, 60-гoддзя з

часу прысваення статуса помніка садова-паркавага мастацтва.

Выданне складаецца з некалькіх раздзелаў: «*Садова-паркавае мастацтва старажытных сядзіб Беларусі - каштоўная частка нацыянальнай спадчыны»*; *«Кобрынскі парк: учора, сёння, заўтра»; «Кобрынскі парк у вершаваных радках»; «Спіс крыніц»; «Алфавітны спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік», «Дадатак».* У сваю чаргу асноўны блок-раздзел «Кобрынскі парк: учора, сёння, заўтра» падзяляецца на наступныя падраздзелы: «*Вехі гісторыі»; «Парк – шэдэўр архітэктурна-ландшафтнага дойлідства Беларусі»; «Экалагічная тэрыторыя: парк флоры і фаўны»; «Арт-аб'екты парку»; «Парк натхнення і актыўнага адпачынку»;* «*Свет дзяцінства ў парку»; «Сучасныя перспектывы».*

Бібліяграфічны спіс прадстаўлены 226 крыніцамі, уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1961 года. Творы друку згрупаваны па відах: кнігі, брашуры, главы і раздзелы з кніг, энцыклапедычныя артыкулы; артыкулы з часопісаў і газет; інфармацыйна-бібліяграфічныя выданні; архіўныя дакументы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы - па гадах у зваротнай храналогіі, у межах года – у алфавіце аўтараў, назваў артыкулаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі. Адбор крыніц завершаны ў кастрычніку 2023 года.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Дадатак уключае наступныя дакументы: *пастанову* Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 27 ліпеня 2017 года № 41 «Аб зацвярджэнні праекта зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей – «Парк імя А. В. Суворава» на паўднёвай ускраіне г. Кобрына і «Бюст А. В. Суворава» ў парку імя А. В. Суворава ў г. Кобрыне», *пастанову* Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2007 года № 72 «Аб абвяшчэнні стварэнняў садова-паркавага мастацтва ў Брэсцкай вобласці батанічнымі помнікамі прыроды рэспубліканскага значэння», *Пашпарт раслін*, які з дакладнасцю адлюстроўвае колькасны склад прыроднага багацця парку.

У інфармацыйна-пазнавальным даведніку шырока прадстаўлены ілюстрацыйны матэрыял, фотаздымкі розных гадоў з фондаў ККЗУП «Парк імя А. В. Суворава», УК «Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава», іншых крыніц.

Выданне адрасавана ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, экалогіяй.

# САДОВА–ПАРКАВАЕ МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНЫХ СЯДЗІБ БЕЛАРУСІ – КАШТОЎНАЯ ЧАСТКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ




*Карта-схема размяшчэння палацаў, паркаў і сядзіб на тэрыторыі Кобрынскага раёна*

Садова-паркавае мастацтва, мастацтва стварэння садоў, паркаў, сквераў, бульвараў і інш., заснаванае на выкарыстанні для арганізацыі прасторы жывога расліннага матэрыялу, аб'ядноўвае яго з мастацкай творчасцю. У аснове шматгранных форм садова-паркавага мастацтва ляжаць два прынцыпы - рэгулярны (геаметрычны) і пейзажны (жывапісны, які імітуе натуральны ландшафт).

У Беларусі першыя звесткі аб існаванні садоў адносяцца да XV стагоддзя, найбольш старажытныя з вядомых садова-паркавых комплексаў створаны ў XVIII стагоддзі.

Берасцейская зямля вызначалася мноствам унікальных шэдэўраў замкавай архітэктуры, палацава-паркавага і сядзібна-паркавага мастацтва.

На працягу дзесяці стагоддзяў развіваліся на Берасцейшчыне замкі і палацы, сядзібы і фальваркі, якія з’яўляліся не толькі своеасаблівым адбіткам мінуўшчыны, але і ўнікальнымі каштоўнасцямі для выхавання многіх пакаленняў. Дастаткова сказаць, што ў пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі сучаснай Брэсцкай вобласці налічвалася каля 1500 сядзібна-паркавых і палацава-паркавых аб'ектаў (сядзіб, фальваркаў і маёнткаў), у т. л. на тэрыторыі Брэсцкага раёна - 109, Баранавіцкага - 192, Бярозаўскага - 46, Ганцавіцкага - 37, Драгічынскага - 85, Жабінкаўскага - 43, Іванаўскага - 47, Івацэвіцкага - 78, Камянецкага - 160, ***Кобрынскага - 194***, Лунінецкага - 31, Ляхавіцкага - 87, Маларыцкага - 34, Пінскага - 199, Пружанскага - 187, Столінскага – 56 (*Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцерчук. Мінск, 2002. С. 4).*



# КОБРЫНСКІ ПАРК: УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

## Вехі гісторыі

Парк з'яўляецца яркім сведчаннем багатай і слаўнай гісторыі Кобрына. Закладзены ў 1768 годзе на паўднёвай мяжы горада паводле распараджэння падскарбія (казначэя) Вялікага княства Літоўскага Антонія Тызенгаўза (1733-1785) пры фальварку, які меў назву «Губерня». На той час Антоній Тызенгаўз служыў распарадчыкам каралеўскіх маёнткаў на тэрыторыі ВКЛ. Да яго дзяржаўцам Кобрынскай эканоміі (колішняга княства) быў Ежы Флемінг.




У 1757 годзе Антоній Тызенгаўз правёў грунтоўную адміністрацыйную рэформу, скасаваў Брэсцкую і Кобрынскую эканоміі, ліквідаваў войтаўствы і воласці, увёў новую адміністрацыйную адзінку - ключ. Такім чынам узнік Кобрынскі ключ, у які акрамя самога горада ўваходзілі фальваркі Залессе і Гарыздрычы, вёскі Дубавое, Ляхчыцы, Лягаты, Патрыкі, Рухавічы, Паляцічы, Плоскае, Хідры. Для зручнасці кіравання ключамі Антоній Тызенгаўз увёў яшчэ адно звяно - губерню. Такім чынам, у 1768 годзе з'явілася Кобрынская губерня. Па загадзе А. Тызенгауза былі закладзены

сядзіба, названая «Губерняй», і вялікі парк, ад якога да Кобрына правялі прамую дарогу — алею, абсаджаную ліпамі. Ад назвы сядзібы вуліца атрымала назву Губерніянская (цяпер вуліца Суворава). Да гэтага часу ў 1766 годзе Кобрын быў пазбаўлены гарадскога самакіравання і ператвораны ў звычайнае землеўласніцкае паселішча пад назвай Кобрынскі ключ Брэсцкай эканоміі.



У 1795 годзе, пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, расійскай імператрыцай Кацярынай II Кобрынскі ключ разам з іншымі ключамі і фальваркамі быў падараваны «в вечное и потомственное владение» расійскаму палкаводцу фельдмаршалу Аляксандру Васільевічу Сувораву (1730-1800) за ратныя заслугі. Тут ён пражываў у 1797, 1800 гадах. Драўляны дом-сядзіба А. В. Суворава ўзведзены ў 1790-я гады, разабраны з-за струхлеласці ў 1894 годзе. Новапабудаваны дом згарэў у час бою ў 1939 годзе.

Пасля смерці Аляксандра Васільевіча Суворава яго сын генерал-лейтэнант Аркадзій Сувораў (1784–1811) быў вымушаны па частках распрадаваць велізарныя абшары маёнтка.

У 1808 годзе цэнтральная частка з паркам і сядзібным домам прададзены маёру Г. Гельвігу.



З сярэдзіны XIX стагоддзя цэнтральная сядзіба належала адстаўному прафесару права Харкаўскага ўніверсітэта Аляксандру Міцкевічу (1801–1871), малодшаму брату знакамітага польскага паэта Адама Міцкевіча. Аляксандр Мікалаевіч памёр у 1871 годзе і пахаваны на старых гарадскіх могілках.

Потым маёнтак перайшоў да Л. А. Зялінскага, жанатага з М. А. Скваронскай - швагеркай Аляксандра Міцкевіча. Міцкевічы тут жылі да 1873 года.

Меркаваць пра першапачатковы выгляд маёнтка цяжка, паколькі са зменай яго ўладальнікаў уносіліся змены і перабудовы. Аднак зыходзячы з кароткіх апісанняў рознага часу, агульная кампазіцыйная структура працягвала існаваць без карэнных пераробак.

Парк, безумоўна, з’яўляецца сведкам багатай, насычанай гісторыі горада. Ім былі пеpажытыя шматлікія гістарычныя падзеі: страшныя пажары, нашэсці войскаў, розныя паўстанні. Відазменены на працягу XIX стагоддзя, ён захоўвае характэрную для рэгулярных паркаў XVIII стагоддзя сіметрычна-восевую разбіўку на раўнінным участку выцягнутай прамавугольнай формы. Асноўная кампазіцыйная вось арыентавана ў напрамку поўнач – поўдзень. Верагодна, парк меў баскетную структуру з дрэў і кустоў.

За гады Вялікай Айчыннай вайны парк падвяргаўся маштабным разбурэнням, большая яго частка была знішчана. Сапраўдны росквіт і развіццё кобрынскага парку можна аднесці да другой паловы XX стагоддзя, калі ён стаў буйнейшым садова-паркавым комплексам сучаснай Беларусі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ўрадам Беларусі было прынята рашэнне наладзіць у парку адпачынак гараджан у вольны ад работы час, таму з 1948 года ён стаў паркам культуры і адпачынку імя А. В. Суворава. Афіцыйнае адкрыццё парку адбылося 18 красавіка 1948 года *(Мартынов, А. Наш парк / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. 1994. 12 лютага. С. 2).*

Вось што пісала газета «Кобрынскі веснік» (тады яна называлася «Труд») у далёкім пасляваенным 1948 годзе: *«В этот день трудящиеся города впервые в его многовековой истории получат место культурного досуга – благоустроенный парк».*



*В. І. Харытанюк з унучкай*

Першым дырэктарам парку стаў Васілій Іванавіч Харытанюк (1876-1977), які з энтузіязмам узяўся за навядзенне элементарнага парадку, прыцягнуў да аднаўленчых работ шырокую грамадскасць, калектывы устаноў, прадпрыемстваў, моладзь горада.

У той час тэрыторыя парку складала 7,5 га. Былі праведзены работы па добраўпарадкаванні з захаваннем прынцыпу рэгулярнай планіроўкі, з’явіліся

прасцейшыя атракцыёны, більярдная, танцавальная пляцоўка.

А да дзесяцігоддзя з дня заснавання парку на яго забалочанай ускраіне была выкапана сажалка, якая ажывіла пейзаж парку.





*Работы па будаўніцтву горкі над возерам у кобрынскім парку, 1954 год*

На гары была ўсталявана скульптура лася. Дарэчы, гараджане







вельмі любілі фатаграфавацца каля гэтай скульптурнай кампазіцыі.

Вакол гістарычнай часткі старога парку пачаў фарміравацца новы парк культуры і адпачынку з элементамі рэгулярнай і пейзажнай планіроўкі. У аснову яго кампазіцыі пакладзены вялікі вадаём з дзвюма выспамі і мысам, выкапаны на заходняй ускраіне ў гонар 10-годдзя парку. З паўночнага боку ў парк вядзе шырокая (да 10 м) ліпавая алея, закладзеная пасля 1905 года на месцы ранейшай з таполі чорнай пірамідальнай. Яе працягам з'яўляецца цэнтральная паркавая алея.




*1958 год*





*Цэнтральная пляцоўка парку, 1957 год*



*Адзіны да 1958 года атракцыён парку «Рускія арэлі»*

Доўгі час, з сакавіка 1958 года па 1977 год, дырэктарам парку працаваў Мікалай Мікітавіч Вымаркаў, дзякуючы актыўнасці якога быў пабудаваны Летні тэатр - адзін з лепшых на Брэстчыне, пашырыліся межы парку, палепшылася яго добраўпарадкаванне, былі ўстаноўлены новыя атракцыёны, закладзены гарадскі стадыён, зроблены водныя веласіпеды.




М. М. Вымаркаў унёс вялікі ўклад у развіццё паркавага ансамбля ў Кобрыне. Дзясяткамі відаў рэдкіх у нас дрэў і хмызнякоў папоўніўся зялёны ўбор парку.



*Летні тэатр у парку,*
*1967 год*

Рашэннем дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па ахове прыроды ад 27 снежня 1963 года кобрынскі парк зацверджаны помнікам прыроды і садова-паркавага мастацтва.



Шмат удалося зрабіць у справе арганізацыі культурна-масавай работы Надзеі Рыгораўне Дземянчук (1940-2001), якая працавала дырэктарам парку з 1977 года да 1993 года. Пад яе кіраўніцтвам значнасць і вядомасць парку паднялася на новую вышыню. Дарэчы, Надзея Рыгораўна была ўдастоена звання «Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь».

У 1983 годзе кобрынскі парк узнагароджаны дыпломам II ступені ВДНГ СССР, прысуджаны сярэбраны і два бронзавыя медалі. Так высока былі ацэнены і прыгажосць, і гістарычнае значэнне парку, і работа, якая праводзілася па арганізацыі цікавага і карыснага адпачынку насельніцтва.





*1984 год*

Пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2007 года № 72 парк імя А. В. Суворава абвешчаны батанічным помнікам прыроды рэспубліканскага значэння *(гл. Дадатак I)*.




У 2007 годзе кобрынскаму парку нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 27 ліпеня 2017 года № 41 зацверджаны праект зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей – «Парк імя А. В. Суворава» на паўднёвай ускраіне г. Кобрына і «Бюст А. В. Суворава» ў парку імя А. В. Суворава ў г. Кобрыне (*гл. Дадатак II*).

Слаўныя традыцыі парку былі закладзены яго былымі дырэктарамі. Нямала сіл і намаганняў Васілія Іванавіча Харытанюка (1948-1958), Мікалая Мікітавіча Вымаркава (1958-1977), Надзеі Рыгораўны Дземянчук (1977-1993) прыкладзена для таго, каб і сёння можна было любавацца прыгажосцю парку.

# Кобрынскі парк – шэдэўр архітэктурна-ландшафтнага дойлідства Беларусі

Кобрынскі парк імя А. В. Суворава – гэта шэдэўр беларускага дойлідства, якім па праву ганарыцца ўся Беларусь. У аснове планіроўкі парку з самага пачатку дамінаваў рэгулярны стыль, толькі пасля дадалося некалькі ўчасткаў, афармленых у англійскім вольным стылі.

У XVIII стагоддзі парк займаў невялікую плошчу, прыкладна 3,5-4 га. У цэнтры парку знаходзіўся пладовы сад і невялікая прамавугольная сажалка. Яго абкружалі земляны вал і глыбокі роў. Сядзібны дом размяшчаўся за партэрам у глыбіні парку на яго планіровачнай восі. Ад дома адкрываўся краявід на вадаём з выспай на заходнім беразе. Паводле распараджэння А. В. Суворава была праведзена частковая перапланіроўка парку (ссечаны састарэлыя таполі ўязной алеі), службовыя пабудовы вынесены за яго межы, а непадалёку ад дома пастаўлена невялікая капліца. Парк быў акаймаваны каналам, злучаным з каналам Бона, які адводзіў ваду ў раку Мухавец.

В. А. Аляксееў, які добра ведаў жыццё і дзейнасць Аляксандра Суворава, у 1905 годзе азнаёміўся з сядзібай і адзначыў: «...*невялікі, абнесены рэдзенькім частаколам англійскі сад - дзесяціны 1,5, ... што акаймоўваўся валам, ровам і пладовымі садамі*».

Відазменены на працягу XIX стагоддзя парк захоўвае характэрную для рэгулярных паркаў XVIII стагоддзя сіметрычна-восевую разбіўку на раўнінным участку выцягнутай прамавугольнай формы. Асноўная кампазіцыйная вось арыентавана ў напрамку поўнач – поўдзень.




*Схема парку імя А. В. Суворава*

У 1948 годзе, праз тры гады пасля Вялікай Айчыннай вайны, сядзіба ператворана ў цэнтральны гарадскі парк культуры і адпачынку, названы ў гонар рускага палкаводца А. В. Суворава. У той час тэрыторыя парку складала 7,5 га. Праведзены работы па ўпарадкаванні парку з захаваннем

прынцыпу рэгулярнай планіроўкі. З паўночнага боку ў парк вядзе шырокая (да 10 м) пад’язная ліпавая алея, закладзеная пасля 1905 года на месцы папярэдняй, высаджанай таполяй чорнай пірамідальнай. Яе працягам з’яўляецца цэнтральная паркавая алея (*працяг вуліцы Суворава; раней была аформлена ў выглядзе грабавай шпалеры з лінейнай абсадкай з елкі*), якая завершана невялікім вадаёмам.

Дзве сіметрычныя цэнтральнай і папярочныя алеі ствараюць сістэму прамавугольных баскетаў (16 розных па памерах). Некаторыя баскеты па дыяганалі перарэзаны лінейнымі пасадкамі ліпы, клёна востралістага. На газонах высаджаны адзінкавыя ці ў выглядзе невялікіх груп бяроза, клён ясенялісты, таполя канадская, клён востралісты, граб. Значна відазменены апошнія два баскеты перад парадным партэрам з традыцыйным кругам. Сіметрычна дома ў баскетах раслі дзве ліпы. Адна з іх захавалася, ёй больш за 200 гадоў.

Вакол гістарычнай часткі старога парку (мясцовасць у старой сажалкі) сфарміраваўся новы парк культуры і адпачынку з элементамі рэгулярнай і пейзажнай планіроўкі. Парк мае ў плане амаль прамавугольную форму з рэгулярнай сістэмай алей, злучаных маляўнічымі дарожкамі.



У аснову яго кампазіцыі пакладзены вялікі вадаём з дзвюма выспамі і мысам. Вадаём злучаецца са

старым каналам, з двух бакоў якога закладзены метадам пасадкі лясных культур насаджэнні дуба чырвонага, бярозы, ліпы.

Кампазіцыйнай воссю з'яўляецца цэнтральная алея (працяг вуліцы Сувораўскай), якая завяршаецца выцягнутым вадаёмам. Перад ім быў дом Аляксандра Суворава, разабраны ў 1894 годзе.





# Экалагічная тэрыторыя: парк флоры і фаўны



Паркі часам завуць душой горада, і ў гэтым ёсць свая логіка. «Душа» і «дыхаць» - штосьці агульнае ёсць у гэтых словах. Дзе, як не ў парку, гараджане могуць удыхнуць поўнымі грудзьмі, насычаючы лёгкія гэтак неабходным у гарадскім жыцці кіслародам? Зялёныя насаджэнні кобрынскага парку з'яўляюцца своеасаблівымі «лёгкімі» нашага горада, аазісам чыстага паветра.

Наогул, зялёны куток Кобрына налічвае больш за 70 відаў дрэў, кустоў, дэкаратыўных насаджэнняў: дуб, ліпа, акацыя, хвоя, розныя віды верб, вяза, таполі, туі, клёну, ясеня і інш. Трапляюцца каштоўныя экзоты - кіпарысавік гарохаплодны, спірэя Біліярдзі, дзявочы вінаград пяцілісточкавы і інш. Парк упрыгожваюць серабрыстая елка, воцатнае дрэва, пірамідальная і кусцістая туі, лімоннік, явар, сібірская абляпіха. Такой

калекцыі пазайздросцяць нават вядомыя батанічныя сады! *(гл. Дадатак III).*

У парку можна ўбачыць як звычайныя для нашай мясцовасці сосны, акацыі, дубы, рабіны, так і дзіўныя прысадзістыя канадскія елкі, магутныя і разгалістыя манчжурскія арэхі.





У старой цэнтральнай частцы захаваліся ліпы, пасаджаныя яшчэ пры жыцці легендарнага рускага палкаводца графа Аляксандра Васільевіча Суворава.

У парку праводяцца прыродазнаўчыя экскурсіі, у час якіх можна пазнаёміцца з яго раслінным светам. Дарэчы, у сувязі з вялікай разнастайнасцю расліннасці супрацоўнікі парку стварылі дзве экалагічныя сцяжынкі. Першая - гэта навучальна-экалагічная, асноўнымі наведвальнікамі яе з’яўляюцца як малодшыя школьнікі, так і старшакласнікі, студэнты. Другая сцяжынка - пазнавальна-турыстычная. На ёй жыхары і госці горада знаёмяцца з прыроднымі і архітэктурнымі аб'ектамі парку.

Праца па ўдасканаленні паркавага ландшафту працягваецца, высаджваюцца рэдкія і каштоўныя ў дэкаратыўным плане дрэвы. Добраўпарадкавана ўся тэрыторыя парку: сфарміравана вялікая колькасць кветкавых кампазіцый з ужываннем новых сучасных метадаў, высеяна велізарная колькасць газоннай травы, пасаджана мноства хмызнякоў.



Арганічна ўпісаліся ў ансамбль векавых дрэў маляўнічыя, клапатліва аформленыя, незвычайныя, яркія клумбы і дэкаратыўныя расліны.





Пры гэтым захоўваюцца векавыя гістарычныя дрэвы і расліны. Напрыклад, толькі ў гістарычнай яго частцы сёння расце больш за 3000 дрэў.





У 2002 годзе ў парку пасаджана Дрэва як сімвал сяброўства беларускага і рускага народаў.

19 сакавіка 2015 года на тэрыторыі гарадскога парку з’явілася алея «Да 70-годдзя Вялікай Перамогі», на якой былі высаджаны 70 белых бярозак у гонар Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, якая страшным полымем пракацілася па нашай зямлі. Каб не забываць тыя суровыя гады, каб новыя пакаленні ведалі, што іх дзяды і прадзеды, нібы дрэвы, каранямі ўраслі ў родныя палі, лясы, але ворага перамаглі.






У 2020 годзе ў кобрынскім парку з'явілася алея сямейных дрэў. Бацькі разам з дзецьмі высаджвалі клёны і ўсталёўвалі імянныя таблічкі. Так з'явілася новая алея, дрэвы на якой пасадзілі маладыя сем'і з горада і раёна.

Блізкасць прыроды ў парку адчуваецца не толькі ад ціхага шэпту лісцяў дрэў, але і ад знаёмства з жывым кутком парку. Наведвальнікі могуць палюбавацца прыгожымі паўлінамі, пакарміць з рук грацыёзных лебедзяў, шустрых і зусім не палахлівых вавёрак.







У 2020 годзе фаўна кобрынскага парку папоўнілася трыма паўлінамі і шасцю румынскімі фазанамі.



Разнастайны і відавы склад птушак. Гэта дразды, гракі, сітаўкі, зімародкі, сойкі і нават совы. А вечарам можна пабачыць вожыкаў, якія спрытна перасякаюць алею. І ўсё гэта побач з горадам, дзе пульсуе напружанае жыццё…







# Арт-аб'екты парку

Падобна таму, як у крылатым выразе «ўсе дарогі вядуць у Рым», усе напрамкі парку сыходзяцца ў пастамента яго галоўнай гістарычнай фігуры – легендарнага палкаводца А. В. Суворава.



У 1950 годзе, у 150-ю гадавіну з дня смерці Аляксандра Суворава, устаноўлены *бронзавы бюст* палкаводца *(скульптар І. М. Рукавішнікаў, бронза; адліўка паводле арыгінала 1904 года).* Вакол помніка разбіта кветкавая клумба, акружаная з двух бакоў невялікімі групамі дрэў з елкі калючай, кіпарысавіка



гарохаплоднага, абляпіхі, туі заходняй, воцатнага дрэва. Межы былога падмурка падкрэслены лінейнай пасадкай елі калючай.



Сёння на пастаменце з'явіўся новы бронзавы надпіс *«Генералісімус Сувораў А. В.»,* падараваны расійскімі сябрамі, перакладзены старыя мармуровыя пліты помніка.

Любімым месцам адпачынку жыхароў горада застаецца пляцоўка каля фантана. *Фантан* размешчаны ў цэнтры круглай пляцоўкі перад уваходам у амфітэатр.



Па крузе пляцоўкі ўсталяваны лаўкі. У вяснова-летні перыяд можна палюбавацца на работу фантана з каляровым падсвятленнем.



Адрэстаўрыраваны фантан упрыгожыла *скульптурная кампазіцыя «Купалле»*, у аснову якой пакладзена нацыянальная тэма, ідэя пра беларускае народнае свята «Купалле». Дарэчы, Купалле – адно з любімых святаў кабрынчан, і па даўняй традыцыі яно праводзіцца ў парку каля возера.



У цэнтры фантана на пастаменце размешчаны тры жаночыя постаці - «тры грацыі», якія трымаюць у руках вянкі. Па задумцы аўтара, члена Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь скульптара Аляксандра Лышчыка, гэта вобразы звычайных беларусачак з доўгімі косамі, апранутых у лёгкія сукенкі. Адна дзяўчына схілілася над вадой, гатовая спусціць вянок у

ваду, другая вяжа вянок, трэцяя дзяўчына ў поўны рост трымае вянок над галавой.

Непаўторнасць парку надаюць арыгінальныя скульптурныя кампазіцыі, малыя архітэктурныя формы, арт-аб’екты, якія размешчаны па ўсёй яго тэрыторыі - львы, лебедзі, чаравічкі, ліхтарыкі і інш.

На варце цэнтральнай алеі - *львы.* Госці горада любяць гэта месца і з задавальненнем фатаграфуюцца са львамі - сімваламі ўлады і велічы ў чалавечай культуры.





*Лебедзі* з'яўляюцца своеасаблівым сімвалам парку,



што пацвярджае і скульптурная кампазіцыя ў выглядзе лебедзяў, якія цалуюцца. Усталявана ў 1950-я гады.



Ёсць у парку так званая *«Лаўка сяброўства, прымірэння»*, на якой не ўседзіш, не памірыўшыся.



Падобныя лавачкі ёсць у шматлікіх гарадах. Яны прызначаны для дваіх чалавек, якія пасварыліся. Лаўка зроблена такім чынам, што прысеўшы на яе, людзі, якія пасварыліся, непазбежна рухаюцца ў цэнтр - адзін да аднаго - і ўрэшце апыняюцца плячом да пляча на прымірыцельнай сярэдзіне лаўкі. Чым не спосаб прымірэння? Дарэчы, лавачка ўжо паспела спадабацца шматлікім кабрынчанам.

*«Фантан улюблёных»,* як і Лаўка сяброўства, з'явіўся ў парку ў 2011 годзе. Мяркуючы па назве фантана, менавіта каля яго адбываюцца спатканні моладзі і сустрэчы закаханых.



Гэты сюрпрыз, як і многія іншыя (вялікія і маленькія львы, ратонда і інш.), для наведвальнікаў парку зрабіў індывідуальны прадпрымальнік Рустам Шадыеў.




Часта ў парк прыходзяць маладажоны, закаханыя пары. Дарэчы, дзякуючы ўсім закаханым у нашым парку «вырасла» *дрэва кахання.* Урачыстае адкрыццё «Дрэва кахання» адбылося 23 верасня 2012 года. У ім прынялі



ўдзел дзве маладыя сям'і, якія змаглі выявіць усю сваю пяшчоту, знаходлівасць і каханне ў займальных конкурсах, а таксама атрымалі права першымі павесіць замочак на «Дрэва кахання».

Трэба адзначыць, што гэты цікавы ландшафтны праект рэалізаваны дзякуючы дырэктару прыватнага прадпрыемства «КІЗБел» Анатолію Паляводзе.

Штучнае дрэва, якое размясцілася ў зоне адпачынку, вельмі элегантнае. На яго галінкі маладажоны вешаюць замкі – сімвалы сваёй сям'і. Ці атрымаецца такім чынам замацаваць каханне да залатога вяселля пакажа час, але ж рытуал прыгожы і сімвалічны. А з часам можа з’явіцца цэлая алея дрэў кахання.

# Парк натхнення і актыўнага адпачынку



Кобрынскі парк - вялікая каштоўнасць, ён служыць людзям. Добра правесці тут свой вольны час могуць усе: ад самых маленькіх жыхароў нашага горада да людзей сталага ўзросту.

Парк - цэнтральнае месца для правядзення мерапрыемстваў рознага маштабу. У любое свята тут цікава і весела. Амфітэатр, плошча з фантанам, два дзясяткі атракцыёнаў, веладарожкі, вадаём з катамаранамі, дзіцячы забаўляльны цэнтр – усё зроблена для разнастайнага і карыснага адпачынку гараджан і гасцей горада Кобрына.



*Амфітэатр* парку – асноўная пляцоўка самых маштабных канцэртаў у горадзе.




На месцы былога драўлянага Летняга тэатра ўзведзены сучасны амфітэатр, будынак якога пабудаваны ў стылі мадэрн і з'яўляецца кульмінацыйнай састаўляючай усходняй часткі парку.




Пакрыццё над сцэнай выканана з металічных канструкцый, дах - з металапрофіля, аднаго з сучасных матэрыялаў. Насупраць сцэны размешчаны галоўны ўваход, справа і злева - яшчэ па аднаму. Адкрытая пляцоўка перад сцэнай можа змясціць да двух тысяч чалавек. Прасторная сцэна адпавядае ўсім законам акустыкі, ёсць камфартабельная артыстычная. Усё гэта дае магчымасць арганізоўваць канцэрты самага высокага ўзроўню. На сцэне сучаснага амфітэатра можна паслухаць мясцовых ці запрошаных выканаўцаў.

Працуе ў парку *святочнае бюро для дарослых,* якое пад заказ рыхтуе разнастайныя карпаратывы, юбілеі, а таксама вясельныя ўрачыстасці на ратондзе з тэатралізаваным суправаджэннем.

Прыцягвае ўвагу асляпляльна белая *ратонда*, якая размясцілася на гары ля возера.



Многія пары змацавалі свой шлюб менавіта тут – на беласнежнай антычнай ратондзе ў прыгожага возера. Трэба адзначыць, што маладажоны займаюць асаблівае месца ў спісе наведвальнікаў парку. З кожным годам вясельныя ўрачыстасці ў паркавым інтэр'еры набіраюць папулярнасць. Але нават тыя, хто абраў для сваёй імпрэзы іншае месца, усё роўна прыходзяць у парк, каб сфатаграфавацца.





Па парку можна праехацца ў сапраўднай *карэце з фурманам.*



Дарослыя зараджаюцца бадзёрым і добрым настроем на спартыўнай і танцавальнай пляцоўках. Зроблена рэканструкцыя галоўнай *танцпляцоўкі* парку. Лаўкі з падстрэшкамі, стыльныя ліхтары, новы сучасны танцпляц - у гэтым кутку парку аматарам танцаў камфортна. Пад рытмы музычных кампазіцый не толькі моладзь, але і тыя, хто не лічыць гады, могуць выдатна правесці час.

Аматары актыўнага ладу жыцця карыстаюцца *лыжаралернай трасай* працягласцю ў два кіламетры, прычым ролікавыя канькі і лыжаролеры можна набыць прама ў парку ў пункце пракату. Арганізаваны пункт пракату веласіпедаў, настольнага тэніса, шэзлонгаў для адпачынку.

Актыўны адпачынак для дарослых і дзяцей забяспечвае *гарадок атракцыёнаў*, які штогод папаўняецца. Вострыя адчуванні можна атрымаць на дарослых і дзіцячых атракцыёнах.



Самымі любімымі з'яўляюцца дарослыя атракцыёны «Каліпса» і «Узлёт» - неверагодныя каруселі, на якіх у наведвальнікаў проста дух захоплівае ад імклівага падарожжа насустрач ветру. Карыстаецца папулярнасцю і сучасны атракцыён з рамантычнай назвай «Вальс», які дазваляе закруціцца ў рытме карусельнага вальса як дарослым, так і моладзі, і выклікае буру захаплення ў прыхільнікаў гэтага атракцыёна.



Той, хто жадае скарыстацца *атракцыёнам «Катамараны»,* можа прагуляцца па новым пірсе, які складаецца з плывучых пантонаў, паплаваць па маляўнічым возеры на водных веласіпедах, бамперных лодках.





3 мая 2016 года адкрыта кропка доступу да бесправаднай сеткі Інтэрнэту. А гэта значыць, што прама ў парку можна мець зносіны з сябрамі ў сацыяльных сетках і знаходзіць новую карысную інфармацыю.



У 2017 годзе ў парку добраўпарадкавана *альтанка для маладых матуль,* дзе можна з камфортам пакарміць і пераапрануць дзіця. Гэта добры, неабходны падарунак для матуль, якія з задавальненнем адпачываюць тут са сваімі немаўляткамі.



Радуюць наведвальнікаў парку арыгінальныя зручныя лаўкі, на якіх прыемна адпачываць. Асабліва шарму ў агульны інтэр’ер дабаўляюць і свяцільнікі ў стылі рэтра.






Працуе ў парку *летняе кафэ «Сава»*, дзе можна смачна падмацавацца, паласавацца марозівам і, наогул, правесці час у прыемнай сяброўскай атмасферы. Размешчана кафэ каля ратонды.

У кобрынскім парку заўсёды знойдуць сабе заняткі па душы людзі самых розных узростаў. Зялёная жамчужына Кобрына даўно стала любімым месцам адпачынку як для моладзі, так і для людзей старэйшага пакалення.

# Свет дзяцінства ў парку











Кожны чалавек, нягледзячы на свой узрост, можа знайсці занятак па свайму густу ў кобрынскім парку. Перавага ў гэтым плане, вядома, аддаецца дзецям.

Для іх працуюць шмат цікавых разнастайных атракцыёнаў і цэлае мора вяселля ў дзіцячым забаўляльным цэнтры «Кеша».

*Дзіцячы забаўляльны цэнтр «Кеша»,* які знаходзіцца ў стылізаваным казачным замку, пачаў працаваць у снежні 2009 года і ўжо стаў сапраўдным брэндам парку.



Тут арганізуюцца разнастайныя мерапрыемствы, якія ўвасабляюць у жыццё самыя неверагодныя дзіцячыя фантазіі. Дзеці могуць акунуцца ў сапраўдную казку ў забаўляльным цэнтры «Кеша», дзе іх чакаюць гульнёвыя





аўтаматы і трохузроўневы лабірынт, казачныя персанажы, ранішнікі, інсцэніраваныя праграмы і незабыўныя ўражанні. Дарэчы, знаходжанне ў трохузроўневым лабірынце – своеасаблівая трэніроўка для людзей, у тым ліку і з захворваннямі апорна-рухальнага апарату. Дзеці і дарос-

лыя з вялікім задавальненнем прыходзяць у гульнёвы цэнтр «Кеша» адпачываць, забаўляцца, весела адзначаць свае сямейныя і іншыя святы, радавацца новым праграмам і казкам.

Побач з імправізаваным замкам - *Паляна казак* з драўлянымі скульптурамі казачных герояў. Выкананыя дзякуючы ўмелым рукам і таленту майстроў па дрэве, яны здаюцца жывымі. Усе героі - персанажы беларускіх народных казак: кот і мыш, певень і ліса, пакаці-гарошак…



Бацькі ведаюць, што дзіцячая пляцоўка ў парку - гэта тое месца, дзе ніколі не будзе сумна іх дзецям.

1 мая 2017 года ў парку адкрылася *забаўляльная пляцоўка «Вавёркадром»* для гульняў і правядзення розных дзіцячых мерапрыемстваў. Назва мае лагічнае тлумачэнне - менавіта ў той частцы парку, дзе пабудаваны «Вавёркадром», можна назіраць вялікую колькасць вавёрак, самых любімых маленькіх жыхароў парку.



Практычна ўсе наведвальнікі прыходзяць сюды з арэшкамі і цукеркамі, каб накарміць гэтых мілых звяркоў. Вавёркі ў парку практычна ручныя, яны зусім не баяцца людзей. Сімвалам пляцоўкі стала вялізная драўляная вавёрка, каля якой любяць фатаграфавацца дарослыя і дзеці.



Пляцоўка падзелена на тры зоны. Першая - гэта міні-сцэна, на якой рэгулярна праводзяцца канцэрты, дзіцячыя гульнёвыя праграмы, фізкультурна-аздараўленчы праект «Зялёны фітнес»; другая - зона адпачынку са сталамі і лаўкамі, дзе можна адпачыць, добра правесці час на прыродзе. Трэцяя зона - дзіцячая забаўляльная, зробленая сіламі супрацоўнікаў парку.







Для дзяцей у парку шмат *атракцыёнаў.* У маленькіх наведвальнікаў асаблівым попытам карыстаюцца атракцыён «Верталёты», дзе кожны можа адчуць сябе бравым пілотам, і «Паветраны батут», які дазваляе паскакаць, спусціцца з горкі, павесяліцца ад душы са сваімі сябрамі.





Самых маленькіх наведвальнікаў парку чакаюць «Конікі, якія скачуць» (*«Скачущие лошадки»*) – легендарны атракцыён, які радуе дзяцей ужо больш за 50 гадоў і з'яўляецца яго доўгажыхаром.











# Сучасныя перспектывы




Парк імя А. В. Суворава – адно з найбольш любімых месцаў адпачынку кабрынчан. Здаецца, сама прырода паклапацілася аб тым, каб кожны чалавек, маленькі ці дарослы, знайшоў тут для сябе заняцце па густу. Парк прывабны сваёй цішынёй, мноствам кветак і зеляніны, утульнасцю ценістых алей і прахладай возера і, безумоўна, комплексам культурна-забаўляльных паслуг, цікавага і карыснага адпачынку.

За свае 255 гадоў парк змяніўся, мае цалкам сучасную інфраструктуру. Новы імідж ён атрымаў пасля масштабнай рэканструкцыі Кобрына ў 2009 годзе. Сур'ёзныя фінансавыя ўліванні ў інфраструктуру і ўдасканаленне парку былі зроблены пры падрыхтоўцы

горада Кобрына да рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі – 2009», і парк зайграў свежымі фарбамі.

Пасля рэканструкцыі парк набыў новы выгляд, пабудаваны розныя аб'екты. Але пры гэтым былі беражліва захаваны як гістарычны каларыт, так і «зялёны акцэнт» тэрыторыі. Рэканструкцыя горада ў 2009 годзе падаравала парку магчымасць расці і развівацца надалей. Менавіта тады гэты зялёны масіўператварыўся ва ўтульны і сучасны куток. Старадаўні парк імя А. В. Суворава адкрыў новую старонку сваёй гісторыі.

Устаноўлены шматлікія архітэктурныя формы, пракладзены сцежкі з мазаічнай пліткай, разбіты клумбы з кветкамі. Абуладкаваны сажалкі, якія арганічна ўпісваюцца ў зялёны масіў, бераг возера набыў выразныя формы. Парк абгароджаны майстарскі выпрабленай дэкаратыўнай рашоткай.

Змянілася аблічча цэнтральнага ўваходу ў парк. Непазнавальным стаў уваход у парк культуры і адпачынку з боку вуліцы 700-годдзя г. Кобрына. Тут ачышчаны і паглыблены абвадны канал, разраўнаваны і добраўпарадкаваны яго берагі. Пераходам у парк з вуліцы стаў новы прыгожы масток.




Парк павялічыўся, і на сённяшні час яго плошча складае 32 га. Дагледжаныя алеі, цікавыя скульптурныя кампазіцыі, беласнежная ратонда, прыгожы будынак амфітэатра, забаўляльны цэнтр «Кеша», атракцыёны… Усё стыльна і сучасна. І толькі векавыя дрэвы захоўваюць гісторыю зялёнай жамчужыны Кобрына.

Сёння парк – гэта камунальнае культурна-забаўляльнае ўнітарнае прадпрыемства (ККЗУП) «Парк імя А. В. Суворава». Яно адказвае ўсім патрабаванням сучаснага часу, што дае магчымасць на самым высокім узроўні, якасна і прафесійна арганізоўваць адпачынак кабрынчан і гасцей горада. Шмат намаганняў прыкладаецца для таго, каб парк быў дагледжаным, прыгожым і ўтульным, каб наведвальнікі атрымлівалі максімум пазітыўных эмоцый. У ініцыятыўнага калектыву заўсёды ёсць цікавыя задумкі і крэатыўныя прапановы.




ККЗУП «Парк імя А. В. Суворава» - гэта не толькі прыгожы гістарычны куток прыроды ў гарадскім пейзажы, але і комплекс добрага настрою, цікавага і карыснага адпачынку.



# КОБРЫНСКІ ПАРК
# У ВЕРШАВАНЫХ РАДКАХ

***(вершы, цалкам прысвечаныя парку імя А. В. Суворава, і вершы, у якіх ёсць аб ім згадванне)***

*Геннадий Ганько*

## Сегодня в графском парке старом

Наш парк - тенистый круг аллей,
Поляна сказок для детей,
Фонтан, и музыкальный клуб,
И острова цветочных клумб,
Качелей ряд, Плодовый сад,
Лебяжий пруд...
Когда-то тут Великий русский генерал
Граф Александр Суворов
В своей усадьбе отдыхал
От светских разговоров.
Сейчас заполнен круг аллей
Большим количеством гостей.
Сегодня в графском парке старом
Соединяются сердца.
Сюда спешит любая пара,
Надев на пальцы два кольца.
Сюда заходит посетитель,
Чтоб снять уныние с души.
Сюда приходит и учитель,
И недотепы-малыши.

Сегодня в графском парке старом
Звучат без устали гитары.
Тут место встречи для друзей.
Тут всюду звонкий смех детей.

***Николай Кривогуз***

## Парк Суворова

В летнем парке среди птиц разговоров
Раздаётся где-то трель соловья.
Здесь когда-то Александр Суворов
По алллеям гулял, как и я.

Здесь бродил он по тропинкам тенистым,
Наслаждаясь, полной грудью дыша,
Воздух в парке был прозрачным и чистым,
Отдыхала полководца душа.

Катерина ему парк подарила,
Домик среди парка у пруда,
За ратные труды благодарила,
Кобринским именьем навсегда.

Прошли года и всё здесь изменилось,
Давно тут нет и дома у пруда.
Уж озеро за годы заилилось,
И стала мутной чистая вода.

Где дом был, только памятник остался,
Седой истории витает в парке дух.
Здесь полководец жизнью наслаждался,
Ласкали птицы пеньем его слух.

*Зоя Блохина*

## Мой город вчера и сегодня

Наш старый парк с аллеями из лип;
Высокими и стройными дубами!
Он столько тайн из прошлого хранит,
Хранит надежно — за семью замками.
Стою у озера, и чудится вдруг мне,
Что где-то рядом шепчутся деревья
О том, что было в давнем далеке,
О прошлом вот таком же вот, весеннем.
Текут беззвучно воды, как тогда,
Когда пришла весна в мой город.
И самая красивая звезда
Взошла для тех, кто был так молод.
Идут года, наш город не стареет.
Уходят поколенья — жизнь течет,
И красота его не потускнеет,
И лишь с годами ярче расцветет.
И я сегодня счастлива безмерно,
Что город мой и молод, и в годах,
И можно позавидовать, наверно,
Что он живет и будет жить в веках!

*Наталья Голованова*

## В парке осень

В парке кружат листья — осень ворвалась,
Ветви оголила, кострами разожглась.
Запах дыма горького ластится к земле,
